У СВЕЦЕ КАЗАК

# ЯК ЗВЯРЫ ПОЛІЎКУ ВАРЫЛІ



ЧЫТАЕМ З МАТУЛЯЙ

Ішла неяк Вавёрачка па лесе. Бачыць — расце баравічок, ладненькі ды крамяны. Яна і ўзрадавалася:



— Паглядзіце ўсе, які я грыб знайшла прыгожы!

Раптам з-за дрэва выскачыў Зайчык ды кажа ёй:

— Гэта я грыб знайшоў!

— Не, я першая! — пакрыўдзілася Вавёрачка.



Тут і Вожык, які шапацеў у лістоце непадалёк, далучыўся да спрэчкі:

— Гэта ж той самы грыб, які я яшчэ ўчора знайшоў!

Доўга яны думалі-вырашалі, каму баравічок павінен дастацца. І ў рэшце рэшт вырашылі грыб на тры часткі падзяліць.



Тут вызірнула з норкі Мышка і кажа:

— Не сварыцеся, калі ласка! Гэты грыб мне трапіўся на вочы яшчэ пазаўчора, але я не зразала: хацела, каб ён падрос.

— Значыць, гэта Мышкін грыб, — сталі наперабой казаць усе.

— Не! — не пагадзілася Мышка. — Гэты грыб агульны.

— Як жа нам яго падзяліць?

— Давайце зварым з яго поліўку, — прапанавала Мышка.



Тут Зайчык узгадаў, што ў яго недзе быў рэцэпт смачнага грыбнога супу.

І закіпела праца: хтосьці ўзяў у Барсучка вялікі кацёл, Мышка прынесла чарпак, Зайчык надзеў фартух і каўпак.

Вожык насіў з лесу галінкі, а Вавёрачка, як самы сапраўдны палявы кухар, раскладала на вялікай паляне вогнішча.



А галоўным кулінарам выбралі Зайчыка, таму што толькі яму быў вядомы сакрэтны рэцэпт. Смачная грыбная поліўка варылася ў катле, Зайчык памешваў яе чарпаком, дадаваў цыбулю, журавіны, духмяныя прыправы. Ах, як жа прыемна пахла з катла!



І, вядома, поліўка атрымалася вельмі смачнай. Усе елі яе і хвалілі кухара:

— Што за Зайчык! Вось гэта малайчына!



— Ну, што вы! — засаромеўся кухар. — Дзякаваць трэба не толькі мяне. Яшчэ і Мышку за тое, што першай знайшла грыб, але не з’ела яго.

— Як жа я магла з’есці яго адна, калі ён наш, агульны! — адказала на гэта Мышка.





**Серыя «У свеце казак»**

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**ЯК ЗВЯРЫ ПОЛІЎКУ ВАРЫЛІ**

*ДЛЯ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ*

Дызайн *І. В. Рэзько*

Адказны за выпуск *І. В. Рэзько*

Падпісана да друку 07.04.2014. Фармат $70 \times 90^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Умоўн. друк. арк. 0,59. Тыраж 1500 экз. Заказ 950.

ТАА «Харвест». Пасведчанне аб ДРВВРДВ № 1/17 ад 16.08.2013.
Вул. Кульман, д. 1, корп. 3, пав. 4, к. 42, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.
E-mail рэдакцыі: harvest@anitex.by
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
Пр. Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.

ISBN 978-985-18-2925-1

9 789851 829251

**ISBN 978-985-18-2925-1**

© Падрыхтоўка, афармленне.
ТАА «Харвест», 2014